# Экасістэма вялікага горада

**Тэма паасобнага збору адходаў надзвычай актуальная для нашай краіны. Яе нядаўна абмяркоўвалі спецыялісты прыродаахоўнай галіны ў Нацыянальным прэс-цэнтры. Пагаварыць пра асаблівасці экалагічнага маніторынгу і кантролю ва ўмовах мегаполіса на прыкладзе Мінска за круглым сталом сабраліся прадстаўнікі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, Мінскага гарадскога камітэта прыроды і аховы навакольнага асяроддзя.**

## Назіраць, але не прыцягваць

— Трэба сказаць, што маніторынг і кантроль — гэта дзве розныя рэчы, паколькі ў рамках маніторынгу мы назіраем, даем ацэнку, прагноз зменаў, але не можам прыцягваць юрыдычных асоб да адказнасці, — адзначыла Паліна Пальчэх, вядучы інжынер службы экалагічнай інфармацыі дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі цэнтр па гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя». — Маніторынг як сістэма быў створаны ў Беларусі ў 1993-м. І практычна 29 гадоў таму была прынята пастанова, паводле якой пэўныя віды маніторынгу аб'ядналіся. У цяперашні час у нас ёсць 13 відаў маніторынгу па асноўных кампанентах навакольнага асяроддзя: атмасфернага паветра, паверхневых вод, зямель, надземных вод, лясоў, расліннага свету, азонавага пласта, жывёльнага свету, радыяцыйны і г. д.

Паводле слоў спецыяліста, Беларусь не стаіць на месцы, і ў 2015 годзе быў уключаны новы від маніторынгу — комплексны маніторынг экасістэм на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях. А ў 2022-м далучыўся і пачаў функцыянаваць комплексны маніторынг тарфянікаў. Таксама варта адзначыць, што ўсе віды маніторынгу нарматыўна замацаваныя.

## Куды дзець пратэрмінаваныя лекі і батарэйкі?

Жыхары сталіцы ахвотна займаюцца паасобным зборам пратэрмінаваных лекавых сродкаў. Аб гэтым расказала начальнік аддзела кантролю за абыходжаннем з адходамі Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Алена Аўраменка. Па яе словах, больш за тысячу тон лекавых адходаў было сабрана і правільна ўтылізавана за 2021 год.

— Ужо ў дваццаці паліклініках усталяваныя спецыяльныя кантэйнеры, куды грамадзяне могуць прынесці нявыкарыстаныя імі прэпараты і пакінуць іх там. Назапашаныя лекавыя адходы затым вывозяцца і спальваюцца, — канкрэтызавала спецыяліст.

Трэба сказаць, што для іншых відаў небяспечных адходаў у Мінску таксама дзейнічаюць сістэмы паасобнага збору. Напрыклад, для адходаў, якія ўтрымліваюць ртуць, — батарэйкі, электралямпы — ёсць спецыяльныя кантэйнеры ў крамах і іншых месцах продажы бытавой тэхнікі. Што тычыцца буйнагабарытнай бытавой тэхнікі, то яе вываз арганізуюць пряма з хаты — дастаткова зрабіць заяўку спецыялізаванай арганізацыі.

## Збор другасных матэрыяльных рэсурсаў

Па выніках 2021 года ўзровень выкарыстання адходаў у Беларусі склаў 29%, на 4% больш, чым у 2020 годзе.




**ПРАВІЛЫ АБЫХОДЖАННЯ З БЫТАВЫМІ АДХОДАМІ**

■ выкарыстоўвайце спецыяльныя кантэйнеры для розных тыпаў адходаў

■ здавайце другасную сыравінуў пункты нарыхтоўкі

■ не выкідвайце старую бытавую тэхніку, а вывозьце яе ў пункты прыёму

■ абыходзьцеся з небяспечнымі адходамі без шкоды для прыроды і здароўя

! Штогод у краіне ўтвараецца больш за 4 млн т цвёрдых камунальных адходаў

(Крыніца: ДУ "Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў"
© Інфаграфіка)

**Дні шкла і пластыку**

Цікава адзначыць, што Мінскі гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя накіраваў у Мінгарвыканкам прапанову, якая дапаможа, на іх думку, павялічыць у сталіцы долю здабывання другасных матэрыяльных рэсурсаў з камунальных адходаў. Аб гэтым таксама паведаміла Алена Аўраменка.

— Праблема складаецца ў тым, што адходы, адсартаваныя насельніцтвам на дваровых тэрыторыях, часта трапляюць у змешаным выглядзе на сартавальныя лініі, — канстатуе спецыяліст. — З аднаго боку, гэта адбываецца, таму што людзі кідаюць у кантэйнер не тое, што трэба, а з другога — іх вывозяць адным смеццявозам, у якім усё змешваецца, ўшчыльняецца, пасля чаго аддзяліць іх на лініях сартавання практычна немагчыма.

Камітэт прапануе вывозіць на сартавальныя лініі адходы, сабраныя на дваровых тэрыторыях, па днях тыд-ня ў залежнасці ад іх відаў — шкло, пластмасу, паперу.

— Калі на сартавальную лінію будуць трапляць адходы ў асобным выглядзе, прасцей будзе праводзіць іх дадатковае сартаванне і здабываць другасную сыравіну, — мяркуе Алена Аўраменка.

Такі вопыт, па яе словах, ужо паспяхова выкарыстоўваецца ў іншых рэгіёнах.

Штогод у Мінску ўтвараецца каля 700 тысяч тон смецця. У мінулым годзе ўсяго толькі 30 адсоткаў з іх былі вынятыя ў якасці другасных матэрыяльных рэсурсаў і атрымалі другое жыццё.

**Ангеліна БАРАТЫНСКАЯ**